Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 120 (28230) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АСАБЛІВАЯ МІСІЯ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў юнакоў і дзяўчат краіны з Днём моладзі**

«Сёння грамадства ўскладае на вас вялікія надзеі, бо новае аблічча эканомікі, культурнага і грамадскага жыцця краіны шмат у чым будзе залежаць ад арганічнага ўключэння маладога пакалення грамадзян у вырашэнне самых адказных і складаных задач», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Прыемна бачыць, што ў нас актыўная, думаючая моладзь, неабыякавая да будучыні роднай Беларусі. Многія з вас дасягаюць поспехаў у вучобе і працы, творчасці і спорце, паказваюць прыклад міласэрнасці і гуманізму», — адзначыў Прэзідэнт.

Дзяржава робіць усё магчымае для таго, каб кожны малады чалавек змог выбраць свой прафесійны шлях, пабудаваць шчаслівае жыццё і прымяніць здольнасці на карысць Радзімы, гаворыцца ў віншаванні.

## Маладыя!

### Заўтра — Дзень моладзі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ІАСУБ, фінансавы аналітык:**

*«Я не раіў бы рабіць нейкія маніпуляцыі з валютнымі зберажэннямі на фоне змяненняў курсаў долара і еўра ў сувязі з вынікамі рэферэндуму па выхадзе Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. Адназначна зараз нічога рабіць не варта. Тыя курсы, якія цяпер устанавіліся, — гэта вынік павышанай валацільнасці. Наогул, калі гаварыць аб валютных зберажэннях, то заўсёды мэтазгодна захоўваць сродкі ў некалькіх валютах, напрыклад, у доларах і еўра або ў доларах, еўра і расійскіх рублях. Тады ў выпадках, падобных да сённяшняга, адна частка зберажэнняў таннее, але гэта кампенсуецца тым, што іншая частка даражэе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20051,00 | ▲ |
| Еўра | 22271,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 306,57 | ▼ |
| Укр. грыўня | 806,39 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

16120>

■ Абітурыент-2016

## ТАЙНА ЗА СЯМЮ ПЯЧАТКАМІ

### ШТО АДБЫВАЕЦЦА З РАБОТАМІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЦТ?

**Цэнтралізаванае тэсціраванне набліжаецца да свайго завяршэння. Большая частка абітурыентаў ужо «адстралялася» — у графіку ЦТ засталося ўсяго некалькі дысцыплін. Праўда, застаецца яшчэ рэзервовы дзень — для тых, хто прапусціў экзамен з уважлівай прычыны. Парушальнікі правілаў ЦТ і абітурыенты, якія спазніліся на тэсціраванне без уважлівай прычыны, пераздаць тэсціраванне ў рэзервовы дзень не змогуць, а значыць, яны засталіся за бортам прыёмнай кампаніі. Найбольшая колькасць «прагульшчыкаў» была зарэгістравана традыцыйна на самых масавых дысцыплінах — рускай мове і матэматыцы.**

### Сакрэт дзяржаўнага значэння

Першыя вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання з'явіліся ўжо ўчора. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў «горача» як ніколі — да пачатку прыёму дакументаў трэба не толькі паспець праверыць работы ўсіх удзельнікаў ЦТ, але і перадаць сертыфікаты ў пункты правядзення тэсціравання.

СТАР. 5



■ Прагнозы

## Медыкі, эколагі, цырульнікі

### Якія прафесіі будуць запатрабаваныя праз пяць гадоў

**«Столькі вучыўся, а нікуды не магу ўладкавацца», — наракаюць некаторыя выпускнікі. Штогод частка моладзі не знаходзіць сабе работу па спецыяльнасці і ідзе працаваць па прынцыпе «куды возьмуць». Якія прафесіі выбраць сённяшнім абітурыентам, каб пасля вучобы быць запатрабаванымі на рынку? І хто ж са спецыялістаў у 2020 годзе аказацца не пры справе? Разбіраемся разам з экспертамі.**



### У прыярытэце — высоканавуковыя тэхналогіі

Адной з самых запатрабаваных прафесій застануцца медыкі, лічыць **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

— З аднаго боку расце працягласць жыцця, пажылых становіцца больш, з іншага — павялічваецца нараджальнасць, — тлумачыць устойлівы попыт на ўрачоў эксперт. — Гэтыя ж прычыны, дарэчы, будуць абумоўліваць і патрэбу ў работніках сацыяльнай сферы. Плюс у Беларусі развіваецца экспарт медыцынскіх паслуг, да нас актыўна едуць лячыцца замежнікі.

Будуць у трэндзе прадаўцы і спецыялісты сферы паслуг: цырульнікі, афіцыянты. Гэта прафесіі, дзе камп'ютар не зможа замяніць чалавека, таму патрэба ў такіх кадрах не знікне. Застануцца творчыя прафесіі, але пры гэтым варта разумець, што попыт на іх заўсёды невялікі. І конкурс у нашы ВНУ на творчыя спецыяльнасці гэта пацвярджае.

— У прыярытэце — развіццё высоканавуковых тэхналогій, а значыць будуць неабходны айці-спецыялісты (ад тэсціроўшчыкаў да праграмістаў) і інжынеры. У сувязі з будаўніцтвам атамнай станцыі перспектыўным кірункам стане ядзерная энергетыка, тым больш, што кваліфікаваных работнікаў у гэтай галіне ў Беларусі пакуль няшмат, — дадае Алег Токун.

Калі казаць пра сельскую мясцовасць, то там заўсёды быў попыт на аграномаў, ветэрынараў, механізатараў, трактарыстаў. Ён захаваецца, хоць і ў меншай ступені. У вёску таксама прыходзіць аўтаматызацыя, і там, дзе раней на ферме было занята 40-50 чалавек, цяпер дастаткова шасці.

У цэлым, мяркуе прадстаўнік міністэрства, будуць неабходны прафесіі, якія патрабуюць творчага асэнсавання, а не механічнага выканання дзеянняў.

### Спецыялісты па тэндэнцыях

Два гады таму ў «Сколкава» выпусцілі «Атлас будучых прафесій». Па ацэнках даследчыкаў, якія складалі даведнік, да 2020 года на біржы з'явіцца больш за 120 новых спецыяльнасцяў. Многія з іх будуць звязаны з экалогіяй: урбаніст-эколаг (яго задача — праектаваць высокатэхналагічныя «зялёныя» гарады), спецыяліст па пераадоленні сістэмных экалагічных катастроф (гэта катастрофы, працяглыя ў часе, якія ўсведамляюцца людзьмі паступова, напрыклад забруджванні вакол буйных прамысловых цэнтраў, радыяцыйныя звалкі), спецыяліст па рэцыклінгу адзення, экааналітык у здабыўных галінах.

СТАР. 4